# Прамова С. О. ПРЫТЫЦКАГА

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Дарагія мінчане, паважаныя госці!

Дарагія таварышы і сябры!

Вялікае і радаснае свята адзначае ў гэтыя дні беларускі народ. Чвэрць стагоддзя мінула з памятных дзён, калі гераічная Савецкая Армія пры актыўнай падтрымцы партызан разграміла і выгнала з зямлі беларус-

кай полчышчы гітлераўскіх захопнікаў.

Чвэрць стагоддзя — тэрмін немалы. А асабліва ў нашым, дваццатым стагоддзі. Шмат падзей велізарнай гістарычнай важнасці адбылося за гэты час на зямлі і нават у космасе. За гэтыя гады зарубцаваліся раны вайны, пазарасталі салдацкія акопы. Але не пагасла, заўсёды жывая і будзе жыць памяць аб вялікім подзвігу народным.

Адзначаючы сёння слаўны дзень вызвалення, мы ўспамінаем і вогненныя вёрсты баёў, і горыч беззваротных утрат, і радасць перамогі. Ад тых навальнічных дзён перадаюць ветэраны вайны эстафету мужнасці новым пакаленням, якія дастойна панясуць яе ў будучыню, захоўваючы вернасць рэвалюцыйным, баявым і працоўным традыцыям нашага народа, свята аберагаючы памяць аб тых, хто змагаўся за гонар і незалежнасць нашай вялікай Радзімы.

Савецкі сацыялістычны лад выхаваў людзей мужных, стойкіх і моцных. У адной калоне, у адным страі крочаць бацькі і дзеці — равеснікі перамогі і тыя, хто здабываў яе сваёй мужнасцю, непахіснай стойкасцю ў жорсткіх бітвах з ворагам. Пераемнасць пакаленняў, калі лепшыя рысы аднаго пераходзяць да другога, — гэта якраз і ёсць тое, што стварае непахісную ўпэўненасць у перамозе камуністычнага заўтра.

Таварышы! У гэты светлы і радасны дзень мы з вамі нібы робім агляд ратных і працоўных подзвігаў беларускага народа. І міжволі памяць вяртае нас да падзей тысяча дзевяцьсот сорак першага года. Вораг абрушыўся на савецкую зямлю. Вераломны, каварны, ён агнём і свінцом паліваў гарады і вёскі, разбураў, грабіў, раніў і забіваў. Ён разлічваў на лёгкую перамогу, але праліčыўся. На крывавым шляху гітлераўцаў сцяной станаві-

Увесь свет цяпер ведае і ўшаноўвае найвялікшы гераізм абаронцаў цытадэлі на Бугу — крэпасці-героя Брэста. Больш як месяц яны сталі насмерць. Камені, жалеза не вытрымлівалі. Савецкі чалавек вытрымаў усё, як яму наказвала Радзіма.

Гераічнае супраціўленне сустракалі акупанты на кожнай вярсце нашай зямлі. У гарадах і пасёлках актыўна дзейнічала бальшавіцкае падполле, лясы і пушчы правадзілі ў паход народных мсціўцаў.

Партызанскі рух у Беларусі сабраў пад свае баявыя сцягі амаль паўмільённую армію адважных байцоў. А дапамагаў ім увесь народ. Дзень і ноч гарэла зямля пад нагамі гітлераўцаў, ляцелі пад адхон эшалоны фашысцкіх ваяк. Народныя мсціўцы грамілі гарнізоны акупантаў, рабілі рэйды па тылах ворага. Партызанская вайна ішла на ўсёй тэрыторыі нашай рэспублікі.

У гэтай свяшчэннай барацьбе народ нараджаў герояў. Іх бессмяротныя подзвігі назаўсёды застануцца ў нашай памяці як прыклад беззапаветнага служэння сацыялістычнай Айчыне.

Савецкі народ пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі разграміў гітлераўскія орды пад Масквой і Сталінградам, на Доне і Каўказе, пад Арлом і Курскам. «Усходнім валам» хацеў адгарадзіцца вораг ад магутнага наступлення Савецкай Арміі. Але не дапамаглі яму ні вал, ні іншыя ўмацаванні.

3-га ліпеня 1944 года Мінск сустракаў сваіх вызваліцеляў — воінаў Савецкай Арміі. У хуткім часе ад гітлераўскіх захопнікаў была ачышчана ўся тэрыторыя рэспублікі. Беларуская наступальная аперацыя яркай старонкай увайшла ў гераічны летапіс барацьбы савецкага народа за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы. Гэта выдатная перамога Савецкіх Узброеных Сіл з'явілася важным плацдармам Савецкай Арміі для далейшага наступлення на ворага, для разгро-

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы